# Новае налічэнне дапамог па дзяржаўнаму сацыяльнаму страхаванню падставе звестак персаніфікаванага ўліку

З 1 студзеня 2024 года ўступаюць у сілу нормы пастановы Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 30 снежня 2022 г. № 945 «аб змяненні пастаноў Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь», у адпаведнасці з якімі змяняецца парадак прызначэння дапамог па часовай непрацаздольнасці і па цяжарнасці і родах (далей – дапамогі).

Згодна з унесенымі зменамі дапамогі асобам, якія працуюць па працоўных дагаворах (кантрактах), будуць прызначацца толькі па асноўным месцы працы з улікам заробку ва ўсіх працадаўцаў і пры ўмове, што па астатніх наяўных месцах працы яны таксама будуць «знаходзіцца на бальнічным».

Дапамога па часовай непрацаздольнасці грамадзянам, якія маюць страхавы стаж 10 гадоў і больш будзе прызначацца ў памеры 100 працэнтаў з першага дня непрацаздольнасці. Калі страхавы стаж менш за 10 гадоў, дадзеная дапамога будзе прызначацца ў памеры 80 працэнтаў сярэднядзённага заробку за ўвесь перыяд непрацаздольнасці.

Пры гэтым захаваецца льгота па прызначэнні дапамог у памеры 100 працэнтаў з першага дня непрацаздольнасці асобам, якія даглядаюць за хворым дзіцем, асобам, якія пацярпелі ад катастрофы на ЧАЭС і інш., а таксама пры прызначэнні дапамогі па цяжарнасці і родах.

Акрамя таго, павялічыцца мінімальны памер дапамогі, які будзе разлічвацца з памеру мінімальнай заработнай платы з улікам індэксацыі за месяц, папярэдні месяцу наступу права на дапамогу.

Сярэднядзённы заробак для вылічэння дапамог работнікам будзе вызначацца з выплат, на якія налічваліся абавязковыя страхавыя ўзносы, ва ўсіх працадаўцаў (у тым ліку былых) У 18 каляндарных месяцах папярэдніх кварталу, у якім паўстала права на дапамогу.

Памер сярэднядзённага заробку будзе ажыццяўляцца аўтаматызавана на падставе дадзеных персаніфікаванага ўліку і прадастаўляцца бухгалтарскай службе па яе запыце праз інфармацыйны рэсурс «Асабісты кабінет плацельшчыка узносаў», размешчаны на карпаратыўным партале Фонду сацыяльнай абароны насельніцтва Міністэрства працы і сацыяльнай абароны (далей – Фонд). Пры гэтым плацельшчыка абавязковых страхавых узносаў важна ўсведамляць, што ад своечасовасці і паўнаты прадстаўлення ім у органы Фонду

дакументаў персаніфікаванага ўліку (формы ПУ-2 і ПУ-3) наўпрост залежыць памер будучай дапамогі работніка.

Новаўвядзенні накіраваны на роўныя падыходы па аплаце лісткоў непрацаздольнасці для грамадзян, якія ўдзельнічаюць у сістэме дзяржаўнага сацыяльнага страхавання.